3. Габович, М. Статьи. Воспоминания о М.М. Габовиче; вступит. статьи А. Солодовникова и П. Карпа/ М. Габович. – М.: Искусство, 1977. – 237 с.
4. Гаевский, В. Служенье муз... / В. Гаевский // Театр. – 1984. – № 12. – С.54.
5. Красовская, В.М. Русский балетный театр начала XX века: хореографы / В.М. Красовская. – Л. : Искусство, 1971. – Т.1. – 526 с.
6. Скляревская, И. Советский балет/ И. Скляревская // Парный портрет: Дягилев и Баланчин. – 1990. – № 1. – С. 28–31.

Протасеня М.А., магистрант
дневной формы обучения
Научный руководитель – Криволап А.Д.
кандидат культурологии, доцент

## ДЗЯДЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ: АРХАІКА АБРАДА

Памяць аб памерлых продках з’яўляецца важнай часткай беларускай культуры, адным з яе “стаўпоў”. Менавіта таму, у традыцыйным абрадавым каляндары беларусаў важнае месца займаюць памінальныя дні і нават тыдні, якія маюць агульную назву “Дзяды”. Так, узімку продкаў успаміналі на Масленічныя і Стрэчан’скія Дзяды, вясной адзначалі Радунічныя Дзяды ці Радуніцу – гэтая традыцыя захавалася і да сённяшняга дня. Улетку было прынята ушаноўваць продкаў на Траецкія і Спасаўскія Дзяды, а восенню праводзілі Стаўроўскія, Пакроўскія, Міхалаўскія, Піліпаўскія, і, зразумела, Галоўныя Дзяды [1].

Вышэйназваныя народныя святы сёння цесна звязаны з царкоўным каляндаром, таму нейкіх дакладных дат святкавання ў праваслаўных вернікаў не існуе – кожны год Дзяды адзначаюцца ў розныя дні, у залежнасці ад месячнага каляндара. Але трэба адзначыць, што разыходжанні ў колькасці

Дзядоў на год фіксуюцца ў межах невялікіх тэрыторый і характэрны нават для суседніх вёсак. Так, у канцы XIX ст. жыхары в. Падмікітаўка Лепельскага павета паміналі сваіх памерлых пяць разоў на год, у той час як суседнія зарачане – шэсць [4].

Зусім іншая сітуацыя ў каталіцкіх вернікаў – у іх не было прынята шанаваць продкаў падчас года, але 2 лістапада заўсёды лічыўся днём ушанавання памерлых, які таксама сёння вядомы пад назвай Дзяды.

Такім чынам, Дзяды – гэта не нейкі адзіны дзень, калі беларусы ўшаноўваюць сваіх продкаў, а поўны цыкл святочных абрадаў, які і каталікі, і праваслаўныя адзначалі ў пачатку лістапада.

Цікава, што адначасова з беларусамі, таксама ў пачатку лістапада, прынята ўшаноўваць сваіх продкаў у Лацінскай Амерыцы, Мексіцы, Заходняй Еўропе і нават ў Азіі і Акеаніі. Такім чынам, амаль што увесь свет ушаноўвае сваіх продкаў менавіта ў гэтыя дні. Але чаму менавіта пачатак лістапада быў абраны ў якасці памінальных дзён, і чаму традыцыі святкавання Дня памерлых вельмі падобныя ў розных краінах? Паспрабуем разабрацца ніжэй.

Існуе некалькі асноўных версій узнікнення традыцыі шанавання продкаў. Некаторыя даследчыкі гавораць аб тым, што значную ролю ў гэтым адыграла культура Старажытнага Егіпту, іншыя лічаць, што сёння мы адзначаем гэты дзень дзякуючь скіфам, але найбольш лагічная і дасканалая версія выглядае так: культ продкаў прышоў да славян ад кельтаў.

Згодна са шматлікімі крыніцамі, кельты жылі на тэрыторыі сучасных Брэтані, Вялікай Брытані і паўночнай Францыі. Некаторыя даследчыкі гавораць аб тым, што традыцыя ўшаноўвання продкаў прыйшла да нас ад паганцаў – гэта сапраўды так, таму што кельты і былі паганцамі. Але астатнія плямёны, якія таксама жылі на гэтай тэрыторыі, не пакланяліся памёрлым продкам, таму мы можам казаць аб тым, што гэта традыцыя належала менавіта кельтам.

Прычынай з’яўлення такой традыцыі быў незвычайны каляндар: кельты падзялялі год толькі на зімовую і летнюю часткі. Яны лічылі, што, пачынаючы з 1 лістапада, Бог Сонца Беленус і да самага Бельтайна (свята пачатку лета) знаходзіцца ў палоне ў Соўіна – Бога памерлых, а таксама ўладальніка цемры і хаосу. У гэтую ноч, з 31 кастрычніка на 1 лістапада, якую называлі Самайн, кельты палілі вогнішчы і хадзілі на могілкі, пакідаючы дары продкам. Друіды збіраліся ў дубовых гаях на вяршынях пагоркаў, запальвалі вогнішчы і прыносілі злым духам ахвяры, каб ўласкавіць іх. А ў раніцы друіды дарылі людзям вуголле ад сваіх вогнішчаў, каб тыя распальвалі агмені сваіх дамоў. Агонь друідаў абаграваў хаты на працягу доўгай зімы і ахоўваў дом ад нячыстай сілы.

Акрамя таго, друіды прадказвалі будучыню па малюнках, якія заставаліся на костках забітых жывёл, якія кідалі ў агонь. Праз вогнішчы скакалі людзі, ці проста праходзілі паміж імі – дадзены рытуал нібыта ачышчаў людзей ад злых духаў. Часта паміж вогнішчамі таксама праводзілі жывёлу [3].

У славянскай міфалогіі таксама можна сустрэць гэты абрад. Лічылася, што 31 кастрычніка Белбог канчаткова перадае ключы царства Яві Чарнабогу, а яго жонка Мара-Марэна, багіня зімы, холаду і смерці пачынае панаваць ва ўсім свеце. Сёння гэты дзень вядомы ў славян як Вялесава ноч – час вялікай сілы, калі вытанчаюцца мяжы паміж рознымі часткамі сусвету, калі духі нашых продкаў і тых, што будуць жыць пасля нас, паўстаюць неад’емным цэлым.

У славян не было прынята неяк святкаваць гэтую ноч. Людзі лічылі, што ў Вялесаву ноч кожная дзвер можа стаць адлюстраваннем той самай чароўнай мяжы паміж сусветамі, а чалавек, які выйшаў на дарогу, трапляе зусім не на знаёмую сцежку, а на дарогу ў свет Наві. Таму ў свята стараліся не адпраўляцца ў далёкія вандроўкі, не прымаць у госці незнаёмых падарожнікаў, а то і зусім не выходзіць з хаты [5].

У гэты дзень таксама папіналі продкаў, аднак, у адрозненні ад Дзядоў, іх не запрашалі да стала – пачастунак духам продкаў пакідалі на парозе або на акенцы звонку дома. Унутры жылля таксама клалі падарунак дамавіку, каб падзякаваць яго за дапамогу і абарону сям'і. Лічылася добрым, калі ўсю ноч у вашым доме будзе гарэць жывы агеньчык свечкі, які нібыта праганяе цемру.

Што датычыцца Дзядоў, то іх пачалі адзначаць праз дзень пасля Вялесавай ночы. У народным каляндары гэтыя даты амаль што не адрозніваліся, таму што ў шматлікіх вёсках Вялесава ноч разглядалася як пярэдадне галоўнага памінальнага дня, да якога ставіўся асноўны комплекс абрадаў.

Вялесава ноч і Дзяды – зразумела, паганскія святы, але калі на тэрыторыю Беларусі прыйшло хрысціянства, праваслаўная царква пачала хутка прымяркоўваць паганскія святы да царкоўных. Так, Купалле сталі называць днём Іаана Хрысціцеля, а дзень Трыглава стаў Тройцай. Тое ж адбылося і з Дзядамі – іх пераўтварылі ў Дзмітрыеўскую бацькоўскую суботу, якую сталі адзначаць на трэці тыдзень пасля Пакрова.

Але нельга сказаць, што праваслаўная царква поўнасцю разбурыла традыцыйная святы беларускага каляндара. Шматлікія элементы старажытных абрадаў былі ўключаны народам ў праваслаўныя святы, і, такім чынам, яны зліліся. Так, людзі пачалі называць праваслаўнае свята Іаана Хрысціцеля днём Івана Купалы. Нягледзячы на зварот у хрысціянства, славяне працягвалі шукаць папараць-кветку і прыгаць праз вогнішча.

Дзяды, у сваю чаргу, таксама захавалі сваю першапачатковую назву, і менавіта ў Беларусі, як лічаць сучасныя даследчыкі, традыцыі правядзяння гэтага абрада, у адрозненні ад іншых славянскіх краін, захаваліся лепей за ўсіх.

Што датычыцца каталіцкай традыцыі святкавання Дзядоў, то ў іх ёсць дакладная дата – 2 лістапада. У гэты дзень каталіцкая царква адзначае Дзень усіх памерлых вернікаў. Згодна з крыніцамі, Дзень усіх памерлых верных

быў уведзены абатам Адылонам Клюнійскім ва ўсіх храмах бенедыктынскага абацтва Клюні ў Францыі. Да нашых дзён захаваўся яго дэкрэт, датаваны 998 годам. Неўзабаве гэтая традыцыя распаўсюдзілася на ўсю каталіцкую царкву. У Рыме гэтае свята з'явілася ў пачатку XIV стагоддзя.

З святкаваннем гэтага дня звязана легенда аб тым, як пілігрым, які вяртаўся са Святой зямлі, быў выкінуты штормам на пустынны востраў. Пустэльнік, які жыў там, распавёў яму, што пасярод скал ёсць расколіна, якая вядзе ў чысцец, адкуль раздаюцца стогны душ грэшнікаў [2]. Ён таксама сцвярджаў, што чуў, як дэманы скардзіліся на сілу малітваў, якія ратуюць іх ахвяры, асабліва прыносяцца за памерлых манахамі абацтва Клюні. Вярнуўшыся дадому, Пілігрым распавёў пра гэта абату Адылону Клюнійскаму, які і ўсталяваў 2 лістапада Днём заступніцтва за душы ўсіх памерлых перад Богам.

У славян-католікаў Дзяды таксама вядомы пад назвай "Задушкі" ці "Задушны дзень" – так звычайна гавораць у Польшчы, ці "Душачкі" – гэтая назва распаўсюджана ў Славакіі.

Такім чынам, Дзяды – гэта дахрысціянская традыцыя памінання продкаў, якая была перанята славянамі ад кельтаў. Дакладна вызначыць дату яе ўзнікнення немагчыма, але вядома, што гэта адбылося значна раней, чым гавораць афіцыйныя дадзеныя. Нягледзячы на спробы царквы знішчыць абрад і перарабіць яго ў хрысціянскае свята, шматлікія асаблівасці правядзення абрада, характэрныя для кожнага з рэгіёнаў Беларусі, дайшлі да нашых дзён, і пачалі паступова знікаць толькі ў апошнія дзесяцігоддзі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А.Е. Богданович. – Гродно: Губернская типография, 1895. – III, 186 с.

2. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. – 338 с.
3. Пенник Н. История языческой Европы/ Н. Пенник. – СПб.: Издательская группа «Евразия», 2000. – 168 с.
4. Пшэлко, А.Р. Деды. Этнографический очерк из жизни Лепельских белорусов / А.Р. Пшэлко. – Витебск : Губернская Типо-Литография, 1898. – 23 с.
5. Сайт Миртесен [Электронный ресурс]: "Осенние Деды" или Хэллоуин. Велесова ночь. – Режим доступа: https://welemudr.mirtesen.ru – Дата доступа: 25.03.2022.

Пыжик А.А., студент 220э группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Навроцкая О.А.,
старший преподаватель

## ДУЭТНАЯ ХОРЕОГРАФИЯ В СОВРЕМЕННОЙ ТВ-ИНДУСТРИИ

Дуэтный танец как форма хореографического произведения представляет собой парное взаимодействие двух исполнителей, реализация которого возможна с помощью выразительных средств различных видов танцевального искусства - классического, народно-сценического, историко-бытового, современного и других танцев. Дуэтная хореография является необыкновенным вариантом демонстрации общения двух людей, осуществляемого с помощью музыкально-пластических образов [3].

Рассматривая дуэтный танец как самостоятельную форму хореографического произведения, Захаров Р.В. разделяет ее на три основных вида - простейшие, танец мужчины и женщины и танец диалог. Простейший вид - это танец в унисон, иногда в таких танцах могут встречаться отдельные